Незалежнае выданьне Жодзіна й Смалявіцкага раёну


Прэс Панарама


№1(18) **2008**

Інфармацыйны агляд рэгіянальных і агульнанацыянальных падзеяў



Навіны, факты, камэнтары, карысныя парады:
эканоміка, грамадзтва, права, зьмены заканадаўства,
калектыўная абарона грамадзкіх інтарэсаў, правоў і свабодаў ...





Ó ÍÓ Ì ÀÐÛ:

* ***ст. 2-3***

- **ЧАРНОБЫЛЬ ... ПАМЯЦЬ і ЎРОКІ**



* ***ст. 3,6,7***

- **ЧАРНОБЫЛЬСКІ ШЛЯХ - 2008 ...**



* ***ст. 4***

- **Скарга з Жодзіна у КПЧ ААН ...**



* ***ст. 8***

- **А Беларусь – жыве!**









Licviny-INFA ПРОСТА – ЖЫЦЬ У СВАБОДЗЕ ... !!!




Беларусы й Чарнобыль

ЧАРНОБЫЛЬ – НАШ БОЛЬ,
НАШ ЛЁС і НАШАЯ СПАДЧЫНА

ТРЭБА ЗАСВАЙВАЦЬ УРОКІ І СТВАРАЦЬ ЛЕПШУЮ ГІСТОРЫЮ, КАБ ЖЫЦЬ У СВАБОДЗЕ, ЛЮБІЦЬ І ЎПЭЎНЕНА ГЛЯДЗЕЦЬ У БУДУЧЫНЮ...

Ïðýñ ÏÀÍÀÐÀÌÀ



Ініцыятыва
“Мы - Ліцьвіны”
& Licviny-INFA

×ÀÐÍÎÁÛËÜÑÊ² ØËßÕ

Ï À Ì ßÖÜ ² ¡ÐÎ Ê²





ФОТАРЭПАРТАЖЫ: www.licviny.info

ГЛЯДЗІ ТУТ:

http://licviny.info/archives/368

http://licviny.info/archives/400

НА ЧАРНОБЫЛЬСКІ ШЛЯХ З ЖОДЗІНА ТРЭБА БЫЛО ДАБІРАЦЦА ПРАЗ МІЛІЦЭЙСКІЯ КАРДОНЫ





Так ужо традыцыйна міліцыя выконвае замову па “фільтрацыя” зь рэгіёнаў актывістаў на масавыя акцыі ў Менску, аказваючы на псыхалягічна-адміністрацыйны ўціск і зьмяншаючы колькасьць іхных актыўных удзельнікаў.

На парушэньне, пры гэтым, элемэнтарных грамадзянскіх правоў і свабодаў – ніхто не зважае. У тым ліку – і пракуратура. У іх у дадзенай “замове” – своя “сьціплая роля”, далёкая ад тых, што прапісаныя ў адпаведных законах і вызначаюць кола службовых абавязкаў нашых з вамі “праваахоўцаў”.

У любым выпадку, падобны дыскрымінацыйны стан, у якім апынуліся апанэнты ўлады ды іхныя сем'і, прымушае ўлічваць дадзеныя абставіны як аб’ектыўны фактар і шукаць спосабы пазбавіцца ад падобнага ўціску – знаходзіць спосабы ўсё ж дабрацца да Менску праз “міліцэйскія кардоны” на дарогах …

Ня гледзячы на падобную сумніўна праўную актыўнасьць беларускіх (у тым ліку й жодзінскіх) “праваахоўнікаў” некаторым з актывістам пашчасьціла дабрацца ў Менск, дзе 26.04.2008г. адбылося традыцыйнае масавае мерапрыемства “Чарнобыльскі Шлях”, у якім па розных падліках прыняло ўдзел ад “некалькі соцень” (БТ, ОНТ …) да 4-5 тысячаў грамадзянаў з Менску, Жодзіна, Гомеля ды іншых гарадоў краіны.

Пасьля масавага садыскага разгону маніфэстантаў на Дзень Волі 25.03.2008г. у Менску, што супала з значнымі рэлігійнымі сьвятамі, а таксама пасьля апошняга недвухсэнсоўнага жорсткага выказваньня прадстаўнікоў улады ў афіцыйных рэпартажах па тэлебачаньнях напярэдадні маніфэстацыі, шмат хто ў Беларусі пачаў усьпрымаць усталяваўшыйся тут рэжым надзвычай сур’ёзна і, урэшце зразумеў, што мае справу з добра адмабілізаванай злачыннай і, нават, садыскай сыстэмаю, пабудаванай на аўтарытарызме, безпраўі і прымусе.

Таму, верагодна, шмат каму проста не захацелася чарговы раз псаваць сабе настрой, выглядам ачмурэлых ад “ідэалягічнай накачкі” спэцназаўцаў, тым больш, трапіць у аўтазак і атрымаць потым без асаблівых разьбіральніцтваў альбо адміністратыўны арышт, альбо матэрыяльныя страты ў выглядзе штрафу.

Аднак, нягледзячы на ўсе перашкоды, затрыманьні і арышты інфармацыйных матэрыялаў, мерапрыемства ў Менску, як і плянавалася распачалося а 14-00 салідным масавым мітынгам ля будынку Акадэміі Навук – традыцыйнага месца збору ўдзельнікаў “Чарнобыльскага Шляху”.

Па праблемах, зьвязаных:

- з сацыяльнымі гарантыямі для чарнобыльцаў і ліквідатараў аварыіі на Чарнобыльскай АЭС,
- з пытаньнямі рашэньня аб пабудове і праектаваньні ў Беларусі ўласнай АЭС і закрытасьцю дадзенага працэса ад грамадзкага кантролю, у тым ліку, зьвязанага з выбарам тыпу рэактара й краіны, якая будзе ў

Чарнобыльскі шлях 2008

далейшым забясьпечваць дадзены рэактар палівам;

- з духоўным і палітычным “Чарнобылем” у краіне ... выказваліся навукоўцы, грамадзкія актывісты й палітыкі …

Потым, калёна арганізавана прайшла да капліцы, што ля плошчы “Бангалор” і



«Ваяваць» працягвалі на далёкіх подступах да Менску.

Пракуратура, як заўсёды, проста закрыла вочы ...

А ў сталіцы замест ваяроў у масках ці ў крапавых бірэтах (іх, на гэты раз, схвалі па дварах) - працавалі толькі перапранутыя “падсадкі” й “фота-відэа-фіксатары” з экспэртных адзьдзелаў, ДАІшнікі й МЭГАФОНнікі ...



завершылася, сьвяточным набажэнставам і запальваньнем сьвечак.

Звычайна, ад самага пачатку, “Чарнобыльскі Шлях” – заўсёды сымбалізаваў сабою той “шлях пераасэнсаваньня”, якім прайшло й працягвае йсьці да Свабоды беларускае грамадзтва. Ад навуковага тэрміну і асэнсаваньня небясьпекі нябачнага “атаму” – да гэткіх жа важкіх рэчаў у духоўным, грамадзкім жыцьці й палітыцы, у тым ліку, знакавай неабходнасьці і непазьбежнасьці зьменаў масавай сьвядомасьці для пераменаў, якія насьпелі ў справе нацыянальна-духоўнага і дзяржаўнага адраджэньня,



Licviny-INFA



Сьвятлана Лапіцкая

энэргэтычнае бясьпецы, мацаваньні сувэрэнітэту й незалежнасьці Беларусі …

Менавіта таму, традыцыйна і сымбалічна маршрут “Чарнобыльскага Шляху” праходзіў па галоўным прашпэкце сталіцы і ляжаў ад Акадэміі Навук праз Плошчу Перамогі да Плошчы Незалежнасьці.

Нагадаем, што наперадзе шэсьця, якое адбывалася звычайна свабодна па праезнай частці несьлі ікону Маці Боскай і звон …

І ў першы раз за 10 год у 1996 годзе, на шляху маніфэстантаў ўзьніклі кардоны зь міліцыянтамі й вайскоўцамі, спэцназ у касках з дубінкамі … Сапраўдным шокам, у які доўга не хацелася верыць, сталася для грамадзтва тады жорсткае спыненьне 70-тысячнай калёны, у якой была маса людзей зь рэгіёнаў, бацькоў зь дзяцьмі, грамадзянаў моладога й сталага веку

У дадзенай акцыі “духоўна-грамадзкага вандалізму”, скіраванай на пачатак сапраўды масавага і гвалтоўнага наступу на грамадзянскія правы і свабоды ў Беларусі, праявіўся панічны страх рэжыму, які знайшоў сабе апору й падтрымку ў кадравым асяродзьдзі былой партнамэнклятуры (КПБ-КПСС).

А яны ведалі, чаго баяцца – сьляпая падпарадкаванасьць Палітбюро альбо Маскоўскаму Крамлю, прывяла да таго, што пераважная маса радыёактыўных ападкаў была штучным чынам мэтава скіраваная ад Масквы й выпала на тэрыторыі Беларусі.

Чым не цяперашняя “траскатня” Лукашэнкі пра Беларусь як адзіны й апошні абарончы пляцдарм на шляху да Масквы. Падобная халуйская пазыцыя Менскай партнамэнклятуры (якая “спала й бачыла” сябе на павышэньні – у Крамлі) , якая і ў 1986г. дзейнічала ў межах вядомай і сёньня ў 2008г. афіцыйнай дактрыны, згодна зь якой Беларусь разам з усімі людзьмі і тэрыторыяй разглядаецца ў якасьці звычайнага “абарончага буфэру” Масквы – прывяла да таго, што Катастрофа сусьветнага маштабу, сталася сапраўднай трагедыяй, збольшага, толькі для Беларусі ...! Тут проста не было гаспадара! Тут прадавалі народ за намэнклятурныя выгоды чыноўнікаў! Тут праводзіўся і працягвае праводзіцца й сёньня жудасны па цынізму экспэрымэнт над людзьмі… Варта толькі прыглядзецца й прыслухацца наўкола – сапраўднасьць не шкадуючы б’е наўпрост у сэрца. Гэта, як дзень, відавочна –
асабліва, калі вы свабодны чалавек і не жадаеце станавіцца “пародыстым падпаскам” альбо звычайным рабом у новага сорту “чырвоных рабаўладальнікаў” …

Працяг на стар. 4, 6-7



ÏÐÀ¡ÍÛ ÔÀÐÏÎÑÒ

Чарнобыльскі шлях 2008







ФОТАРЭПАРТАЖЫ:
www.licviny.info

ГЛЯДЗІ ТУТ:
http://licviny.info/archives/368
http://licviny.info/archives/400

Працяг, пачатак на стар. 2-3

Працяг на стар. 6,7

Licviny-INFO

Праваабарона

ПАДАДЗЕНА СКАРГА Ў КПЧ ААН

Жодзінскі праваабаронца дапамог падаць зварот у Камітэт па ПРавах Чалавека пры ААН у Жэнэве (Швэйцарыя). Індывідуальная скарга пададзена па факце непраўамернай забароны гарадзкімі ўладамі мірнага мітынгу жыхароў Жодзіна напярэдадні Беларускага “Дня Волі”, што звычайна сьвяткуецца 25 сакавіка 2008 году і скіраваны на падтрымку Незалежнасьці Беларусі, а таксама пакараньня Аляксандра Камароўскага як аднаго з арганізатараў мірнай цэрэмоніі ўскладаньня кветак да абеліску памяці абаронцаў Беларусі “Героі жывуць вечна” на 7 сутак турэмнага зьняволеньня . Згодна з Міжнародным Пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах і Факультатыўным пратаколам да яго, кожны грамадзянін пры парушэньні ягоных правоў і свабодаў пры бязьдзеяньні нацыянальнай прааахоўнай сыстэмы як паўнавартасны суб’ект Міжнароднага права можа шукаць абароны праз КПЧ ААН (Жэнэва, Швэйцарыя).

Рашэньні КПЧ ААН – абавязковыя для выкананьня ...



Аляксей Лапіцкі



Аляксандар Камроўскі

Licviny-INFA






Дванаццаць патрабаваньняў Эўропы да ўладаў Беларусі - гэта шлях да законнасьці і дэмакратыі, міру і згоды, магчымасьць атрымаць сапраўдную дапамогу для стабільнага разьвіцьця краіны.

ÇÀ Ў¡ÐÀÏÅÉÑÊ² ÃÎÐÀÄ!

Photo: Licviny-INFA





Як кажуць тут “міліцыянты-афіцэры” – гэта рэжымная ўстанова, таму закон (напрыклад Выбарчы Кодэкс) у ейных межах не дзейнічае, а любая згадка пра права асобы – выклікае тут прылiў некантралюемае агрэсыі ...!?

У якой турме іх гэтаму навучылі!? АЛЕ Ў МІЛІЦЫІ ЗАРАЗ - УЖО НОВЫ БУДЫНАК. А ці зьменіліся іхныя падыходы да грамадзянаў і грамадзянскага права!? Усё можа быць. Хто ведае, можа новы загад атрымалі!? (сапраўды па загадзе тут усё магчымае).

Перадвыбарча-НОВЫЯ ФАСАДЫ АТРЫМАЎ І АСІЛАК! І дыму паўбавілася неяк ... Пацаны з “нулёўкі” глядзяць і кажуць ... - АГІТАЦЫЯ, сродкаў на ПІАР зь бюджэту падкінулі!





А на рэстаўрацыю гарадзкога “ТАНКАДРОМУ” – чарговы 101 раз, проста сродкаў не хапіла ... !?



І гэта - зусім не МЕСЯЦ! Гэта - у нас пад нагамі.





Photo: Licviny-INFA

http://licviny.info/archives/579

ПЭЎНА ЗАПАМЯТАЛІ ПАФАРБАВАЦЬ ТРАВУ Й БАРДЗЮРЫ ... !?

Альбо не хапіла бялілаў ... Ці можа нехта, урэшце, зразумеў – колькі не зафарбоўвай тое, на што глядзець балюча й сорамна, яно застанецца гэткім жа страшэнным, бязгустоўным і непрывабным як і было. Дзіравы бюджэт і безгаспадарчасьць, адсутнасьць якасных матэрыялаў і тэхналёгіяў, звычкі імкнуцца да прыгожага і жыць у прыгажосьці ... – не кампэнсуецца таннай саўковай “паказухаю” ...

А імкненьне жыць цікава і з густам, не ў “віртуальным заўтра”, але ў “натуральным сёньня” ёсьць вынікам канчатковага асэнсаваньня грамадзтвам неабходнасьці кардынальных пераменаў да лепшага, да новых каштоўнасьцяў і свабоды, права і прыгажосьці – да абсалютна новай якасьці жыцьця ...

Здольнасьці разумець, адчуваць і ствараць сапраўдную прыгажосьць, будаваць сапраўды ўтульны й квітнеючы дом для ўласных дзяцей прыходзяць неадразу. Яны нараджаюцца – у свабодзе творчай і мастацкай, палітычнай і грамадзкай, у свабодзе адчуваньня і выказваньня сябе, сваіх думак і памкненьняў гэтак шчыра і дакладна, як ты іх усьведамляеш ...

А гэта можа стацца магчымым толькі тады, калі няма “наглядальніка” і “калючага дроту”, калі зламаныя стэрыятыпы, калі ёсьць свабода жыць, свабода самавыяўляцца – падтрыманая і разьвіваемая дзяржаваю свабода індывіда быць сабою і жыць у свабодзе ...

Без гэтага, як не зафарбоўвай нашу сумную сапраўднасьць, пакуль не станеш свабодным, дагэтуль будзеш маляваць і будаваць казармы – замест цывільнага жыльля, у якім хочацца жыць; танкадромы – замест ходнікаў і дарогаў, па якіх прыемна хадзіць і езьдзіць; рэклямаваць СПЭЦНАЗАЎЦАЎ і АЎтаЗакі – замест свабодных, счаслівых грамадзянаў і вясельна-ўрачыстых лімузінаў ...

Таму, арыентацыя не на правільную ідэалёгію, а на чалавека, ягоную годнасьць як найвышэйшую дзяржаўную каштоўнасьць – адзіная правільная й вартая ўвагі арыентацыя ..., якая вядзе да прыгажосьці, дастатку й дабрабыту.

Ініцыятыва “ЗА ЭЎРАПЕЙСКІ ГОРАД!”

×ÀÐÍÎÁÛËÜ!

Працяг, пачатак на стар. 2-4

НА ЧАРНОБЫЛЬСКІ ШЛЯХ З ЖОДЗІНА ...





Спыніць у 2006 годзе “Чарнобыльскі Шлях”, азначала для Менскага рэжыму – паказаць, што ў Беларусі, як і раней, усё пад кантролем і Масква можа й надалей цалкам разглядаць нашую краіну ў якасьці “буфэрнай зоны” ці “мішэні №1” ва ўмовах любых канфліктаў, у тым ліку й тэхнагенных форсмажорных абставінаў.

Здаеца, менавіта тады грамадзяне Беларусі атрымалі свой першы ганебны “рэфэрэндум”, за якім пачаўся працэс мэтанакіраванага ўмацаваньня рэжыму, адпрацоўкі мэханізмаў падаўленьня і прымусу, стварэньня сыстэмы татальнага кантролю і запалохваньня ў грамадстве …

Перафарбаваная парт-намэнклятура (КПБ-КПСС-аўцы і спэцы рознага калібру) сёньня фактычна застаюцца ва ўладзе. Яны зрабілі працу над памылкамі, трохі перафарбаваліся, асвоілі новую тэрміналёгію й прыёмы рыторыкі …, але яны – здольныя на ўсё!

I гэта сёньня, як ніколі раней, яскрава адчула беларускае грамадзтва. Улада якая мусіць абараняць і працаваць на агульныя інтарэсы – здрадзіла ўласным абавязкам, сваім грамадзянам …
Яна як і раней прадалася, здалася ў палон уласных настальгічных мараў пра “былы КПСС-аўскі рай” і “Крамлёўскія прывілеі” …

Яны, як і 20 год назад, сёньня жывуць не ў незалежнае Беларусі, але на ейнае тэрыторыі (!).

Аднак, пры гэтым, яны лічаць, што аніводныя выбары не павінны быць пагрозаю іхнаму надзейнаму ўтрыманьню ўлады. Ледзь не штодзённыя іхныя заявы пра тое, што “яны” сыйдуць тады, калі вырашаць пастаўленыя імі ж задачы, тобок палічуць гэта неабходным …, а не тады, калі будуць пераабраныя на выбарах, кажуць толькі пра тое, што дадзены Канстытуцыйны мэханізм дэмакратычнага абнаўленьня ўлады і кіраваньня краінаю для іх – ужо даўно не існуе.

I гэта – вынік “палітычнага Чарнобылю” у Беларусі!
Краіна, ейны дзяржаўны арганізм, будзе спажываць яго да тых пор, пакуль цалкам не асэнсуе, не адчуе кожным сваім мускулам, кожнай сваёй клеткаю, усім уласным існаваньнем неабходнасьць рэальных пераменаў да лепшага.

I на колькі падаецца рэальным і разумным у існуючае сытуацыі, “Чарнобыльскі Шлях”, шлях ад “трагедыі рабоў” да радасьці перамогі “свабодных грамадзянаў” мусіць ісьці ад неправамернай практыкі “прызначэньня ва ўладу” да сапраўдных, свабодных і дэмакратычных выбараў ...
Толькі тады, калі ва ўладзе на розных узроўнях будуць не “марыянэткі”, а сапраўдныя й пасьлядоўныя “прадстаўнікі народу” (апазыцыя ці вымушаныя апанэнты цяперашняе улады сёньня, бо ўлада слухае і чуе толькі сама сябе), Беларусь здолее стацца не “буфэрам” для любых “прывэнтыўных udараў” (газавых, … ядзерных) у небясьпечных гульнях Крамлёскіх палітыкаў (накшталт Жырыноўскага), а нармальнай цывілізаванай Эўрапейскай краінаю без гвалту накшталт “вайсковых становішчаў” ці “паліцэйска-ідэалягічных зачыстак”, без абрыдлых маналёгаў і рэгулярных агульнанацыянальных “сэлектарных катаклізмаў” …




... ТРЭБА БЫЛО ДАБІРАЦЦА ПРАЗ МІЛІЦЭЙСКІЯ КАРДОНЫ



А пакуль, каб чарговы раз упэўніцца ў “праўдзівасьці чэснае ўлады” і ейнага “шматканальнага тэлебачаньня”, дастаткова глянуць на зробленыя 26.04.2008г. у Менску фотаздымкі.

Аб тым, як выглядаў “Чарнобыльскім Шлях - 2008” на вуліцах Менсу можна ўбачыць з адпаведнага фотарэпартажу, падрыхтаванага нашымі фотакарэспандэнтамі ў Менску ...







Фота-рэпартажы: http://licviny.info/archives/579






Алесь Вольны,
Licviny-INFO,
Жодзіна.

А БЕЛАРУСЬ – ЖЫВЕ!







Праз дзень пасьля калектыўнай заявы жыхароў з “Народнага пад’езду” “Чарнобыльскага Дому” ... – экспэрыментаваць з верагодным непрыходам грамадзянаў на Скарыненскі выбарчы ўчастак №11улады не сталі ... Зацяжны экспэрымент, што доўжыўся 4 гады адразу скончыўся. Камунальныя службы ўзяліся за справу. Будзем спадзявацца, на гэты раз, абяцаньні цеплавой рэабілітацыі левага тарца й абодвух фасадаў дому будуць выкананы ўчас і без залішняй валакіты.



Паводле акадэміка Івана Нікітчанкі, у Беларусі ў апошнія гады насельніцтва скарацілася на паўмільёна ... А ПРАЎНЫ й ДУХОЎНЫ чарнобыль кожны дзень працягваецца ...

“Народны пад’езд” “Чарнобыльскага Дому” ... – экспэрымент завершаны пасьля калектыўнай заявы й небясьпецы, што выбары на ўчастку не адбудуцца ... !?

Алесь Вольны,
Licviny-INFO,
Жодзіна.

Мусіць быць дзяржаўная праграма выратаваньня свайго народу


Іван Нікітчанка: “Мусіць быць дзяржаўная праграма выратаваньня свайго народу”.

Паводле акадэміка Івана Нікітчанкі, у Беларусі ў апошнія гады насельніцтва скарацілася на паўмільёна. Паводле экспэртаў ААН, да 2020 году ўжо мільёна ня стане. А ў 2050 годзе краіна страціць траціну свайго насельніцтва ...

Паводле Радыё Свабода
Licviny-INFA

У выданьні выкарыстоўваецца правапіс першакрыніцаў (калі ён блізкі да сучаснага клясычнага варыянту). Пераклады робяцца з улікам сучаснай канцэпцыі натуральнага ўнармаваньня абодвух правапісаў (да- і пасьлярэфармаванага). Рэдакцыя працуе без карэктара, таму прыносіць свае прабачэньні за магчымыя адрукоўкі ў тэкстах ...

Фота-рэпартажы: http://licviny.info/



Незалежнае выданьне грамадзкай супольнасьці Жодзіна
(Выдавецкая ініцыятыва “Мы - Ліцьвіны” і агенцыя Licviny-INFA)

Адрас рэдакцыі:
222160 Жодзіна, а/с 201
E-mail: c_licviny@tut.by

Наклад 299 асобнікаў.
Рэдактар АЛЕСЬ ВОЛЬНЫ
Пры перадруку спасылка на выданьне і першакрыніцу абавязковая.